прынцып самаадзначэньня нацыянальнасьцей, а ў першы чарод да Нямеччыны, каторая мае найболей супольных зь Беларуска–Літоўскім краем эканамічных інтарэсаў, з прызывам аказаць помач у справе адбудовы дзяржаўнай незалежнасьці колішняга Літоўска–Беларускага гасударства (Вялікага Княства Літоўскага), не ўзіраючыся ў цяперашні разьдзел яго ліняй фронту.

Вільня, 18 лютага 1918 г.

*Антон Луцкевіч*
*Дамінік Сямашка*
протаіярэй *М. Галянкевіч*, ксёндз *Владыславў Талочка, Казімер Фалькевіч, Іван Луцкевіч, Дулька, Я. Туркевіч, Язэп Салавей, Янка Станкевіч, М. Пэрскі, М. Родзевіч*

## Накід рэзалюцыі Беларускай Рады ў Вільні пра абвяшчэньне незалежнасьці Літвы

Літоўская Рада, як ядыная прадстаўніца літоўскага народу, на засяданьні сваім 16 лютага 1918 году апавесьціла адбудову[1] незалежнасьці Літвы без паказаньня граніц, але са сталіцай у месьце Вільні.

З прычыны таго, што Вільня, лежучы на абшары з пануючай беларускай мовай, ад вякоў станавіла супольную[2] сталіцу Літоўска–Беларускага гасударства, Беларуская Рада мае аснову[3] бачыць у заяве Літоўскай Рады акт умацаваньня адвечнай еднасьці этнаграфічна літоўскіх і этнаграфічна беларускіх зямель, каторы дае аснову для канцэпцыі Літвы ў шырокім разуменьні — у межах колішняга В. Кн. Літоўскага, зложанага пры самых сваіх закладзінах з двох народаў: літоўскага і беларускага.

Беларуская Рада, як ядыная прадстаўніца беларускага народу ў межах акупацыі, заяўляе, што беларусы прызнаюць акт[4] адбудовы незалежнай Літвы[5] толькі ў вышэйсказаным разуменьні — у мысьль рэзалюцыі Беларускай Канфэрэнцыі ў Вільні 25, 26 і 27.I.1918[6].

## Накід тэлеграмы Беларускай Рады ў Вільні райхсканцлеру

Яго Эксцэленцыі
пану Імпэрскаму Канцлеру

Арганізаваныя пры паддзержцы „Entent'ы“ польскія войскі за фронтам занялі Магілёў, Віцебск, Мінск[1]. Як наказываюць[2] Беларускай Радзе, палякі маняцца выкарыстаць гэтыя абшары дзеля замены на округ Беласток–Гродна.

Проці гэтага пляну Беларуская Рада выказывае самы энэргічны пратэст. Беласток–Гродна — гэта спрадвечная этнаграфічна беларуская зямля, далучэньня каторай да Польшчы мы, беларусы, ня можам ніколі дапусьціць.

## Пратэст Прэзыдыюму Беларускай Рады ў Вільні

У апошнім часе ў Бэрліне адбывалася нарада польскіх прадстаўнікоў зь вялікшасьцю Райхстагу, на каторай спрадвечна Беларускія землі разглядаліся як кампэнсацыя Польшчы за адрачэньне яе ад прэтэнзій на Познаншчыну. Хаця нарада мела прэлімінарны характар, аднак яна атрымала значэньне паўафіцыяльнае з прычыны прыняцьця гэных польскіх